## Білет 4

**Практычнае заданне.**
**Развіццё навукі, адукацыі, культуры і спорту ў Рэспубліцы Беларусь.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. Хто каардынуе правядзенне навуковых даследаванняў у Рэспубліцы Беларусь?
2. Складзіце схемы атрымання вышэйшай адукацыі для выпускніка базавай школы.
3. Ці згодны вы з меркаваннем: “Фестываль "Славянскі базар у Віцебску" фарміруе міжнародны імідж нашай краіны?” Свой адказ растлумачце.
4. Прывядзіце аргументы, якія пацвярджаюць выснову: "Беларуская навука адкрывае новыя магчымасці для эканамічнага росту і сацыяльнага развіцця Беларусі".

**I. Схема "Узроўні асноўнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь"**




**II. Дасягненні ў развіцці навукі** *(па матэрыялах вучэбнага дапаможніка "Гісторыя Беларусі. 1917 г. – пачатак XXI ст. 9 клас").*

Цэнтрам развіцця беларускай навукі з'яўляецца Нацыянальная акадэмія навук Беларусі. Беларускія вучоныя ажыццяўляюць мноства даследаванняў практычна ва ўсіх галінах ведаў.

У медыцыне распрацаваны тэхналогіі лячэння з дапамогай ствалавых клетак, дыягностыкі ракавых пухлін, штучныя клапаны для сэрца. Праводзяцца даследаванні па стварэнні штучнага інтэлекту, сістэм беспілотнага транспарта. У машынабудаванні створаны першы ў свеце самазвал БелАЗ

грузападымальнасцю 450 т, які занесены ў Кнігу рэкордаў Гінеса, распрацаваны электробус "Вітаўт". Паспяхова дзейнічае беларуская станцыя ў Антарктыдзе.

Вучоныя-гісторыкі ў сваіх даследаваннях фарміруюць беларускае бачанне айчыннай гісторыі і дзяржаўнасці Беларусі.

У галіне фізікі лаўрэатам Нобелеўскай прэміі стаў ураджэнец Беларусі, савецкі і расійскі вучоны Ж. Алфёраў.

Рэспубліка Беларусь стала касмічнай дзяржавай. На касмадроме Байканур адбыўся паспяховы запуск беларускага касмічнага апарата. Створана самастойная сістэма дыстанцыйнага зандавання Зямлі, якая дазваляе аператыўна атрымліваць неабходныя дадзеныя з космасу. Ураджэнец Беларусі расійскі касманаўт Алег Навіцкі, які атрымаў званне Героя Расіі, здзейсніў чатыры касмічныя палёты.

**III. Новыя традыцыі суверэннай Беларусі** *(па матэрыялах "СБ. Беларусь сегодня")*

Духоўнае багацце народа адлюстроўваецца ў яго звычаях і культуры. Беражліва захоўваючы спадчыну мінулага, суверэнная Беларусь закладвае новыя традыцыі.

Пачынаючы з 1992 года ў Рэспубліцы Беларусь штогод праводзіцца Міжнародны фестываль мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску".

Фестываль садзейнічае развіццю дыялога культур паміж рознымі народамі і краінамі. У горад над Дзвіной у ліпені прыязджаюць сусветныя зоркі і дэбютанты. Высакародная місія "Славянскага базару" сфармулявана ў яго дэвізе: "Праз мастацтва - да міру і ўзаемаразумення". Такую ж назву мае спецыяльная прэмія Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якую ён уручае на фестывалі.

З 2019 года заехаць у Беларусь для наведвання фестывалю можна без візы. Пропускам для бязвізавага перасячэння дзяржаўнай мяжы для замежных грамадзян з'яўляецца білет на мерапрыемствы фестывалю.